# З НОВЫМ ГОДАМ, ТАВАРЫШЫ!




ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 39 (560) | Субота, 31 снежня 1983 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПЛЕНУМ ЦК КПСС

26—27 снежня 1983 года праходзіў чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР М. К. Байбакова «Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1984 год» і міністра фінансаў СССР В. Ф. Гарбузава «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1984 год».

Удзельнікі Пленума з вялікай увагай азнаёміліся з тэкстам выступлення Генеральнага сакратара ЦК КПСС Ю. У. Андропава. Выступіўшыя ў спрэчках выказалі поўную падтрымку палажэнняў і вывадаў гэтага важнага палітычнага дакумента, адзначыўшы, што яны маюць прынцыповае значэнне і павінны быць пакладзены ў аснову дзейнасці ўсіх партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў, грамадскіх арганізацый, усіх працоўных калектываў.

Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Пленум ЦК перавёў з кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС таварышаў В. І. Варатнікова і М. С. Саломенцава.

Пленум ЦК выбраў члена ЦК КПСС таварыша В. М. Чэбрыкава кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Пленум ЦК выбраў члена ЦК КПСС таварыша Я. К. Лігачова сакратаром ЦК КПСС.

Пленум ЦК КПСС аднагалосна прыняў па абмеркаваных пытаннях пастанову, у якой цалкам і поўнасцю адобрыў дзейнасць Палітбюро ЦК КПСС па ажыццяўленню выпрацаванай XXVI з'ездам партыі, лістападаўскім (1982 г.) і чэрвеньскім (1983 г.) Пленумамі ЦК КПСС унутранай і знешняй палітыкі.

Пленум адобрыў у асноўным праекты Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР і Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1984 год і даручыў Савету Міністраў СССР унесці гэтыя праекты на разгляд Вярхоўнага Савета СССР.

Цэнтральны Камітэт КПСС заклікаў рабочых, калгаснікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, інтэлігенцыю, усіх працоўных нашай краіны шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне і перавыкананне плана 1984 года і заданняў пяцігодкі ў цэлым, за дасягненне высокіх вытворчых вынікаў. Ва ўмовах міжнароднай абстаноўкі, якая рэзка абвастрылася па віне імперыялістычных колаў, няўхільнае выкананне планавых заданняў, добрасумленная, высокапрадукцыйная праца — не толькі абавязак, але і патрыятычны доўг кожнага працоўнага калектыву, кожнага савецкага чалавека.

Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС выказаў цвёрдую ўпэўненасць у тым, што савецкія людзі, цесна згуртаваныя вакол ленінскай партыі, будуць нястомна ўмацоўваць эканамічную і абаронную магутнасць нашай Радзімы, прыкладуць усе сілы для дасягнення новых поспехаў у камуністычным будаўніцтве.

(ТАСС).

## СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

МАСКВА. (ТАСС). 28 снежня ў Вялікім Крамлёўскім палацы пачала работу дзевятая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзесятага склікання.

У 10 гадзін раніцы адкрылася сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Працяглымі апладысментамі дэпутаты і госці сустрэлі таварышаў Г. А. Аліева, В. І. Варатнікова, М. С. Гарбачова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, Д. А. Кунаева, Р. В. Раманава, М. С. Саломенцава, М. А. Ціханава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, У. В. Шчарбіцкага, П. Н. Дземічава, У. І. Далгіх, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, В. М. Чэбрыкава, Э. А. Шэварднадзе, М. В. Зімяніна, І. В. Капітонава, Я. К. Лігачова, К. В. Русакова, М. І. Рыжкова.

Дэпутаты зацвердзілі парадак дня сесіі, на абмеркаванне якой вынесены пытанні аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## З ПАЧУЦЦЁМ ПАТРЫЯТЫЧНАГА АБАВЯЗКУ

На фінішы — 1983 год. Як і ўсе папярэднія, залатой старонкай ён упішацца ў слаўную гісторыю першай у свеце Краіны Саветаў. Сёння міжволі мы задумваемся, якім жа быў для нас гэты год? Адназначна не адкажаш. Аднак самымі адметнымі яго вяхамі сталі для савецкага народа чэрвеньскі (1983 г.) і прайшоўшы на гэтым тыдні снежаньскі Пленумы ЦК КПСС, дзевятая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзесятага склікання, завяршыўшая сваю работу напярэдадні Новага, 1984 года. У абмеркаваных на іх пытаннях, прынятых рашэннях яскрава адлюстраваны дасягненні і задачы працоўных нашай сацыялістычнай Радзімы.

Мы радуемся сваім поспехам, крытычна адносімся да недахопаў, імкнемся паўней выкарыстоўваць наяўныя рэзервы і магчымасці. Разам з тым мы, як ніколі раней, устрывожаны напружаным міжнародным становішчам, якое склалася па віне імперыялістычных агрэсіўных колаў і, перш за ўсё, адміністрацыі ЗША і НАТО. Адыходзячы 1983 год запамятаецца як год рашучай барацьбы ўсіх міралюбівых сіл за захаванне міру на ўсёй планеце, недапушчэнне размяшчэння амерыканскіх ракет у Заходняй Еўропе і пагрозы ўзнікнення тэрмаядзернай вайны.

Савецкія людзі ўступаюць у Новы, 1984 год з яснай праграмай. Яна вызначана ў важнейшых дакументах Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Асабліва блізка да сэрца мы прынялі словы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Ю. У. Андропава з тэкста яго выступлення на снежаньскім Пленуме ЦК КПСС аб патрыятычным абавязку кожнага савецкага чалавека працаваць з максімальнай аддачай сіл на карысць далейшага росквіту Айчыны, для ўмацавання яе эканамічнай і абароннай магутнасці.

У гэтай сувязі больш плённа абавязаны працаваць вучоныя, выкладчыкі, усе супрацоўнікі нашага універсітэта. Гонар кожнага студэнта і аспіранта — настойліва авалодваць абранай прафесіяй, сучаснай навукай.

У Новы, 1984 год мы ўступаем у перыяд актыўнай падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Гэтую важную агульнадзяржаўную падзею мы павінны сустрэць дастойна, з высокімі паказчыкамі ва ўсіх сферах свайго дзеяння.

Горача віншуем Вас, дарагія таварышы, з Новым, 1984 годам! Яшчэ большых Вам поспехаў і здзяйсненняў у камуністычным будаўніцтве, у барацьбе за захаванне і ўмацаванне міру на нашай планеце!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ПРАФКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ.

## АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

адбыўся 28 снежня ў актавай зале. З інфармацыйным дакладам аб рабоце ЦК КПБ пасля XXIX з'езда Кампартыі Беларусі выступіў першы намеснік старшыні выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў, член бюро гарадскога камітэта КПБ **М. І. Скрыннікаў**.

Затым па дакладу намесніка сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце **І. В. Нямкевіча** абмеркавана пытанне «Аб партыйным кіраўніцтве грамадскімі арганізацыямі універсітэта».

Па абодвух пытаннях парадку дня прыняты адпаведныя пастановы.

Справаздача аб агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, калектыў праблемнай навукова-даследчай лабараторыі горача віншуюць малодшага навуковага супрацоўніка гэтай лабараторыі КУЗАЎКОВА Аляксея Іванавіча (навуковы кіраўнік — заг. ПНДЛ М. І. ЯГОРАНКАЎ) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата хімічных навук.

* * *

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, матэматычны факультэт, кафедра ВМ і праграмавання горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ГОЛІКА Сяргея Іванавіча ў сувязі з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

Иван ХАРЛАМОВ

## ГОДЫ, ГОДЫ...

Словно дум и треволнений
Завязь,
На лице морщины залегли.
Годы, годы,
В синеве скрываясь,
Вы летите, будто журавли.
Не колеблясь,
Жизнь диктует сроки,
Ставя знак
На каждом рубеже.
Юность,
Даже отзвуком далеким
Ты не откликаешься уже...
Только сердце,
Отмеряя время,
С прошлым расставаясь,
Не грустит.
Как и прежде,
В нем полно горенья,
Радостей,
Укоров
И обид.
Оно вьется,
В путь стремясь неблизкий...
И прекрасны,
Как и жизнь сама,
Молодость —
Отчаянностью риска,
Возмужалость —
Трезвостью ума.

●

Вольга КУРТАНІЧ,
студэнтка 3-га курса завочнага факультэта.

## РАЗВІТАЛЬНАЕ

Ад цябе прымала хрышчэнне,
Поле — дзяцінства песня
і зыбка
Я душой трапяткіх карэнняў
Увайшла ў зямлю глыбока —
глыбка!
Як ад'ехаць мне з роднага
краю,
Неба сіняе і аблокі!
З развітаннем вачамі
ўбіраю,
Каб асветліць імі дарогу.
Як жа дом без сябе
пакінуць,
І не мною разбітыя
шклянкі?
Няхай лічыцца вольнаю
памяць.
Я ад'еду — як паланянка.
Паланянкай, якая мае
Пах палёў, дзе прыйшло
сталенне.
Што ж забраць мне
з роднага краю?
Думкі?
Песні?
Зямлі хрышчэнне?

* * *

Галоўнае прайшло
вадой праз пальцы,
Цяпер вось смага —
прагнем аб вадзе.
Мы — валачобнікі,
мы — бедныя скітальцы,
Зноў нечакана стрэліся
ў бядзе.
...І ўбачылі міраж.

* * *

Твае штрыхі знаходзяцца
паўсюдна:
У бездані вады, у жытнім
полі.
Аднойчы пра цябе —
чужым — забуду,
Ды травы шапаценнем
мне напомняць...
Ты ліўнем загаманіш —
я заплачу,
Ты сонейкам праглянеш —
усміхнуся,
Ты станеш цішынёй,
і я няйначай
Ад гэтай цішыні, відаць,
прачнуся.

## ШЧАСЛІВЫ НОВЫ ГОД

Ноч стаяла ціхая і марозная. Хрустка трашчалі галіны дрэў, стылая кара лопалася з нуднавата-працяглым сумам. Стромка-бязмежнае неба бліпгчэла мільёнам зіхатлівых, нібы жывых вочак. Прасцяг неба нечым нагадваў вялікую летнюю паляну ў буйных спелых суніцах. Нічога, што зоркі адлівалі металічным холадам, што яны здаваліся недасягальнымі. Аксютка неяк не думала пра гэта. Зоркі нагадвалі ёй суніцы, лета...

Дзяўчына апусціла вочы, схілілася над бярэмцам падрыхтаваных з вечара дроў. Выбрала некалькі паленцаў, асцярожна падклала пад чорнае дно сагана на самаробных жалезных прутках, у абдымках чырвона-залатога полымя.

Збоку ад палаткі пачуліся крокі, снег захрумсцеў пад нагамі. Дзяўчына падхапілася, пайшла на шум.

— Ну, як, знайшоў? — яшчэ добра не бачачы ішоўшага, крыкнула яна ў гусцеючую, набіраўшую моц, ноч.

Некаторы час чулася толькі рыпенне снегу. Нечакана і яно сціхла.

— Ау! — кінула дзяўчына ў цемру.

— Уа! — пачулася ў адказ з-за тоўстага ствала сасны. — Што, напалохалася? Вось, трымай, — і хлопец кінуў некалькі яловых галінак з шышкамі на дзяўчыну. Яна войкнула, выставіла наперад рукі, быццам сабралася бараніцца.

А ён, падхапіўшы дзяўчыну на рукі, закружыўся сярод дрэў, паднёс да вогнішча, у якое з саганка сыпаўся кроплямі кіпень. Потым асцярожна апусціў Аксютку на зямлю.

— Дзе святочнае застолле, га? Я цябе пытаю! — жартаўліва і ў той жа час напускаючы на сябе змрочнасць прамовіў Сяргей. Ён набраў поўныя грудзі паветра, быццам іх распірала злоба, і, расставіўшы рукі, рушыў да дзяўчыны. — Усё, плаці штраф, — зрабіў ён выснову. — Інакш...

Што інакш, хлопец не паспеў дагаварыць. Аксютка хуценька схапіла прыгаршчы снегу, сыпанула ў яго расчырванелы твар. — Вось табе: штраф! — са смехам кінулася да палаткі. Праз хвіліну выскачыла адтуль, трымаючы рукзак. Сяргей усё яшчэ прадзіраў вочы ад снегу.

— Святочны стол гатоў! — узяла пад казырок Аксютка, падцягнуўшы да ног Сяргея рукзак.

— Пакуль не бачу, што ён гатовы. Даю дзве хвіліны! — грымеў начальніцкім галасам Сяргей. — Дзве, не больш! І каб стол аж ламаўся ад яды!

...Новы год. Не паспее ён прыйсці, а ўжо думаеш, як яго пражывеш. Не паспееш сустрэць, а глядзіш, трэба праводзіць. І ў апошні дзень, гадзіну старога года невядома чаму зашчыміць раптам сэрца, ахопіць самота. Усведамляеш, што пражыты яшчэ год, штосьці спазнана, знойдзена, або назаўсёды згублена. Пражыты год становіцца гісторыяй. Шкадуеш яго, як нешта жывое, роднае, з кім не хацеў бы расстацца. У апошні дзень, гадзіны старога года некаму хочацца пабыць аднаму, другім — наадварот: у вясёлым коле сяброў і знаёмых...

Сяргей з Аксюткай, крадком сеўшы у цягнік, уцяклі ад ўсіх. Перастукваючы на рэйках, ён павёз іх насустрач Новаму году, насустрач захапляючай невядомасці, у якой яны ўяўлялі трапяткое полымя свайго шчасця...

— Вось-вось Новы год прыскочыць, а ў нас ні ёлка не прыбрана, ні стол не гатовы, — схамянулася Аксютка.

— Пачакай, яшчэ цэлых... — Сяргей паглядзеў на гадзіннік, — трыццаць мінут.

— Усяго?! — дзяўчына пачала хуценька раскрываць рукзак, даставаць падрыхтаваныя пачастункі.

Сяргей асцярожна сабраў раскіданыя ім галінкі з карычневымі шышкамі, прынёс іх да ёлачкі, якую выбрала Аксютка для свята. Зграбная густая ёлачка здавалася кучаравым выпеставаным дзіцём сярод магутных соснаў, танклявых бярозак і кашлатых ёлак.

У зачараваным танцы заскакалі блікі ад полымя на шкляных каляровых цацках, якія дастала з рукзака Аксютка і прымацавала да лапачак ёлачкі. Каля вогнішча, на квяцістай цыраце ламаўся стол (як патрабаваў Сяргей) ад «казачных» страў. А завараны і забыты бурштынава-чорны чай усё булькаў у саганку і плёскаўся на пякучую чырвань вуголляў.

Трэснуўшы, захрыпеў ўключаны Аксюткай старэнькі Сяргееў «Альпініст».

— Са святам вас, дарагія таварышы! З Новым годам! — выгукнуў транзістар.

— Сяргей, шампанскага, хутчэй! — закрычала Аксютка.

Глуха бомкнуў корак з бутэлькі, недзе там, за вогнішчам, мякка шоргнуўся ў снег. Забулькала пузырчата-шыпучае піт'ё. Закружылася над галовамі Сяргея і Аксюткі стылае неба, загамапілі маўклівыя дагэтуль дрэвы, і мароз, здаецца, крыху аслабеў, мацней узнялі перарывістую стралянiну паленцы ў вогнішчы. А зоркі, далёкія зоркі-суніцы пад зачараваную песню захмялеўшага ветру сыпануліся разам са сняжынкамі на плечы шчаслівай пары закаханых.

— Са святам Вас! З новым годам і шчасцем! — здаецца лес, дрэвы шапталі Сяргею з Аксюткай. Ды і як жа інакш — пачынаўся першы іх Новы год, пачынаўся адлік сумеснага іх жыцця.

А снег сыпаў і сыпаў, шапацеў на палогах намётаў, грэўся пад полымем чахлага цяпельца, знікаў у чорнай бурштынаватасці забытага ў сагане чаю.

Анатоль КАЗЛОЎ,
студэнт 4-га курса гістфіла.

Ирина ВЕШНЯЯ

## НОВОГОДНЕЕ КОЛДОВСТВО

### ДА, О СЕБЕ

Нежной быть.
Суровой быть.
Не забыть и
не разбить.
Целовать.
И враждовать.
Веды ведать.
Слово знать.
Честь и душеньку сберечь.
Песни петь.
Ватрушки печь.
Золотить семь раз на дню
голубую тишину.
Даже в слабости своей
быть сильнее дикарей.
Верной быть.
и странной быть!
Ничего не утаить.

### ОТ ЛУКАВОГО

Такой, как я,
ты не найдешь,
хоть тыщу лет ищи!
Ищи-свищи,
ищи-свищи
и в бурях
и в тиши,
в горах, у моря
и в полях,
где тяжко зреет рожь,
в лесных ветвях
— на риск и страх —
и все-же — не найдешь!

### СВЕТЛОЕ

Нежданная,
ты сквозь вечерний снег
придешь —
и станут странными
все звуки,
И музыка
родит счастливый смех,
И расточатся
все врази и муки,
И то, неуловимое всегда,
Что где-то в
Зазеркалье тонко вьется,
Прихлынет, как волшебная
вода,
И песней новой
вспыхнет и прольется!

### НАД ЗЕРКАЛОМ ТЕМНОГО ЛЬДА

Где Ты — человек,
с которым мне хочется
Стать слабой и маленькой —
Не судьёй,
не пророчицей —
Цветочком аленьким?
Где — Человек,
о котором бредится,
Чей голос чудится,
Когда звонкозвездная
Медведица
Бредет полусонной улицей?

### ПОСЛЕДНЯЯ СКАЗКА

Все ждут чудес.
В молчании небес,
в глубоко-радужном,
особенном и тайном...
...Вокруг поляны —
оснежённый лес.
«Что станется — всё будет
неслучайным».
К холодным синим
звёздам из костра
взлетают золотые их
сестрицы.
Мы на снегу станцуем.
До утра.
Проснусь.
Пойму: был — сон...
Поют синицы...

Мікалай КАРТАШЭВІЧ,
студэнт 2-га курса гістфіла.

★ ★ ★

Што за ноч з зімою
сталася?
Ледзь да ранку пратрымалася
І сыпла снягамі талымі,
Пачарнелымі прагаламі.
Сёння зноў жа з тонкай
грацыяй
Лепіць іней на акацыі.



Эдуард АКУЛІН,
студэнт 5-га курса гістфіла.

## ЗІМА

Тканіна белага радна
Усё навокал, —
Слухаў,
як бы настройваў хто
арган, —
Завіруха.

**ЗІМОВАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ.**

На полюсе сцюжным,
Такім далёкім
Пінгвін на льдзіне
Паправіў смокінг.

